# Беражы сябе і свае грошы!

25 сакавіка 2021 года закрытае акцыянернае таварыства «Банк гандлёвы капітал» правяло мерапрыемства ў рамках Тыдня фінансавай дасведчанасці дзяцей і моладзі (Global money week) у дзяржаўнай установе адукацыі «Жабінкаўская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат». Тэматычны акцэнт мерапрыемства - лічбавая дасведчанасць у фінансавай сферы.

У ходзе праведзенага мерапрыемства слухачам распавядалася аб імкліва развіваючыхся лічбавых фінансавых прадуктах і сэрвісах (якія дапамагаюць нам зберагчы сябе, у прыватнасці, ва ўмовах пандэміі), спыніліся на асноўных момантах лічбавай фінансавай бяспекі (якія дапамогуць зберагчы свае грошы).

Асвятляліся пытанні перавагі дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, міжбанкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі, біяметрыі ў сферы фінансаў, асвятлялася тэма сучасных плацежных гаджэтаў, паразмаўлялі пра электронныя грошы.

А вось пра сацыяльную інжынерыю слухачы змаглі расказаць самі вельмі шмат. Хлопцы і дзяўчаты добра дасведчаныя пра ашуканцаў у сацыяльных сетках і як засцерагчы сябе.